# Раздзел 5. ПРАВАПІС АБРЭВІЯТУР

## § 14. Правапіс абрэвіятур

1. У абрэвіятурах скарочаныя часткі пішуцца так, як у адпаведных поўных словах: *гарвыканкам* (*га*радскі *выка*наўчы *кам*ітэт), *галоўурач* (*галоў*ны *ўрач*), *музвучылішча* (*му*зычнае *вучылішча*), *ваенкамат* (*ваен*ны *кам*іс*а*рыя*т*), *ін*тэр*пал* (*інтэр*нацыянальная *пал*іцыя), *член-кар.* (*член-кар*эспандэнт).

2. Літарныя, гукавыя абрэвіятуры і абрэвіятуры змешанага тыпу звычайна пішуцца вялікімі літарамі без кропак, злучкоў і апострафаў: *БДПУ* (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт), *УА* (установа адукацыі), *СНД* (Садружнасць Незалежных Дзяржаў), *СМІ* (сродкі масавай інфармацыі), *УП* (унітарнае прадпрыемства).

- ✓Калі да абрэвіятуры далучаецца лічба, то яна пішацца праз злучок: *МАЗ-200, ВАЗ-21*.
- ✓Калі абрэвіятура скланяецца, канчаткі яе пішуцца малымі літарамі: *у ВАКу, у ЦУМе*.
- ✓Дапускаецца напісанне малымі літарамі агульнавядомых абрэвіятур тыпу *жэс, цэц*.
- ✓Малыя літары пішуцца ў некаторых камбінаваных абрэвіятурах: *БелТА, ЛіМ, УП «Белкніга»*.

3. Напісанне запазычаных абрэвіятур вызначаецца па слоўніку. Поўны сэнсавы беларускі адпаведнік не расшыфроўвае іх, а передае значэнне такіх запазычанняў: *завуч* (наместнік дырэктара па вучэбнай рабоце), *ЮНЕСКА* (Камісія Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры), *АСУ* (аўтаматызаваная сістэма кіравання).

4. У некаторых абрэвіятурах напісанне не супадае з іх вымаўленнем: *РІВШ* (вымаўляецца [*рыўш*]), *ТЮГ* (вымаўляецца [*ц'ух*]).



Літарныя абрэвіятуры не трэба блытаць з умоўнымі графічнымі скарачэннямі, якія ўжываюцца на пісьме, але заўсёды чытаюцца поўнасцю.

5. Скарачэнне слоў рэгламентуецца наступнымі правіламі:

- ✓нельга скарачаць на галосную літару, на ***ь***, на ***й*** і на ***ў***;
- ✓пры спалучэнні дзвюх аднолькавых зычных скарачэнне робіцца пасля першай зычнай: *ваен. завод*;
- ✓пры збегу двух або некалькіх зычных скарачэнне робіцца пасля апошняй зычнай: *народн. казкі*;
- ✓калі імя або імя па бацьку пачынаецца з дыграфа ***Дз***, то ініцыялам выступае толькі літара ***Д***: *Дзяніс Дзмітрыевіч – Д. Д.*

Пры графічных спалучэннях ставіцца кропка і захоўваюцца тыя самыя знакі і пачатковыя літары, якія ўласцівы для поўнага напісання: *В.-Д. к.* (Волга-Данскі канал), *с.-д. партыя* (сацыял-дэмакратычная партыя).

Стандартныя скарочаныя абазначэнні метрычных мер пішуцца без кропак: *кг* (кілаграм), *см* (сантыметр), *т* (тона) і інш.

**Практыкаванне № 29.** Растлумачце ўтварэнне, значэнне і напісанне наступных слоў.

I. Прафсаюз, Беллітфонд, прафкам, рыбгас, гарсавет, камбат, прамкамбінат, Еўрасаюз, юнкар, рацыя, генплан, Белдзяржпраект, лячфак, аблкамунгас, сельсавет, эсмінец, цэхкам, ваенкам, Саўмін, Гомсельмаш, Мінэканоміка.

II. РБ, НАН Беларусі, ТАА, БДПУ, МАК, РВУ, ЗАТ, МТЗ, ЦСУ, РУУС, ВНУ, ВДНГ, БелТА.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Практыкаванне № 30.** Расшыфруйце абрэвіятуры і ўмоўныя скарачэнні і запішыце іх паводле ўзору. Растлумачце ўжыванне вялікай літары.

*Узор:* ВКЛ – Вялікае Княства Літоўскае.
НДІ, СП, БелСЭ, ТЮГ, МДЛУ, нэп, га, стст., з-д, т. зв., н. э.

**Практыкаванне № 31.** Запішыце і запомніце агульнапрынятыя скарачэнні слоў, спалучэнняў слоў, словазлучэнняў.

***Акад.*** – акадэмік; ***б.*** – былы; ***бухг.*** – бухгалтэрыя; ***в.*** – вёска; ***в.а.*** – выконваючы абавязкі; ***в-аў*** – востраў; ***вобл.*** – вобласць; ***воз.*** – возера; ***г.*** – горад; ***гг.*** – гады; ***г.зн.*** – гэта значыць; ***гл.*** – глядзі; ***гр.*** – грамадзянскі; ***дац.*** – дацэнт; ***заг.*** – загадчык; ***зб.*** – зборнік; ***і г.д.*** – і гэтак далей; ***і да т.п.*** – і да таго падобнае; ***і інш.*** – і іншае; ***і пад.*** – і падобнае; ***нам.*** – намеснік; ***напр.*** – напрыклад; ***н.ст.*** – новы стыль; ***параўн.*** – параўнайце; ***п-аў*** – паўвостраў; ***праф.*** – прафесар; ***р.*** – рака; ***р-н*** – раён; ***руб.*** – рубель; ***с.*** – старонка; ***с.-г.*** – сельскагаспадарчы; ***сс.*** – старонкі; ***с/с*** – сельскі савет; ***ст.*** – стагоддзе; ***ст.ст*** – стары стыль; ***т.*** – том; ***тав.*** – таварыш; ***т-ва*** – таварыства; ***тт***. – тамы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ